# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ ВУЧНЯЎ УСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ, ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2012 г.*

## ДАВЕДКІ

### 10 клас

### 1 варыянт

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 4 | 4 | 5 | 6 | 8 | 3 | 5 | 3 | 4 | 8 | 50 |

### Заданне 1

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ: За́нятость – заня́тасць, запа́янный – запая́ны, обувщи́к – абу́тнік, праде́довский – пра́дзедаўскі.

### Заданне 2

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ: **1, 2, 6, 7.**

### Заданне 3

ВАРЫЯНТЫ МАГЧЫМЫХ АДКАЗАЎ: *педагогіка, дыпламатыка, семантыка, энергетыка, раманістыка…*

### Заданне 4

| польскія словы | старaславянскія словы | цюркскія словы |
|---|---|---|
| крэўны<br>пэндзаль<br>сейм<br>футра | агнец<br>вяшчаць<br>улада<br>юны | атаман<br>кавун<br>кутас<br>нагайка |

### Заданне 5

| Назоўнікі беларускай мовы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| м. род | ж. род | н. род | множналікавы | граматычныя характарыстыкі рускіх і беларускіх назоўнікаў супадаюць |
| дышаль<br>жэрабя<br>гадзіннік | маку́ха | зяблíва<br>покрыва<br>(пакрыццё) | козлы | даніна |

### Заданне 6

*Максімальная колькасць балаў – 3 (0,5 – за пару, 2 – за тлумачэнне.*

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: **1** (*класціся – легчы*) і **5** (*браць – узяць*).

КАМЕНТАРЫЙ: Толькі гэтыя дзве пары дзеясловаў указваюць на абмежаванне дзеяння, яго выніковасць (*закончанае трыванне*), што чаргуецца з працягласцю, працяканнем, паўтаральнасцю дзеяння (*незакончанае трыванне*) у межах аднаго лексічнага значэння.

У парах **загадваць** (*кіраваць*) – **загадаць**, **прадугледжваць** – **перагледзець**, **пісаць** – **распісаць** адрозненне ў трыванні суправаджаецца адрозненнем у лексічным значэнні дзеясловаў.

## Заданне 7

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:

1. Складаназлучаны сказ з супраціўнымі адносінамі паміж часткамі.
2. Складаназалежны з паслядоўным падпарадкаваннем даданай часткі ўмовы і дапаўняльнай часткай.
3. Аднасастаўны абагульнена-асабовы сказ, ускладнены адасобленай акалічнасцю.
4. Складаны бяззлучнікавы сказ з супастаўляльнымі адносінамі.
5. Просты развіты няўскладнены сказ.

## Заданне 8

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:

А) байка;
Б) александрыйскі верш;
В) белым.

## Заданне 9

Аўтарам верша "*Усход сонца*" з'яўляецца **ЯКУБ КОЛАС**.

К а м е н т а р ы й : Уважлівае прачытанне твора падказвае наступныя аргументы, якія можна выкарыстаць як абгрунтаванне прыналежнасці верша менавіта Якубу Коласу: народны пясняр стварыў абагульнены нацыянальны краявід, але напоўнены самымі разнастайнымі рэалістычнымі падрабязнасцямі і матывамі. Сярод іх небу адводзіцца важная роля. Гэта ўвасабленне прастору, бязмежжа, свабоды... Адсюль параўнанні, эпітэты, метафары : "*неба грае перлаўным блескам*", "*неба усміхнецца*", "*неба суцэле шаты*"... Якуб Колас – віртуоз гукапісу і малявання словам. Эстэтыка колеру і паэтыка гуку вызначальныя ў яго пейзажных вершах. І ў вершы "Усход сонца" мастак слова праз колер паказаў, якія тоіць у сабе родная прырода дзівосна-чароўныя "*скарбы гожства, сугалосся*".

А колькі фантазіі, пісьменніцкага майстэрства ўкладзена ў вобразы, звязаныя з сонцам. Сярод іх няма звыклых, бляклых, з сонцам нязменна спалучаецца золата:

*Сыпле золата над гаем*
*І над пералескам.*

Найбольш падрабязныя малюнкі ўсходу сонца – Якуба Коласа любімай пары сутак – і ўвогуле самога сонца дадзены ў паэмах.

## Заданне 10

Начавала хмарка залатая
На *грудзях аброву-велікана*,
І ў дарогу *збегла ўранні рана*,
Ведала, бакіт яе чакае:

Ды вільготны след пякуча стыне
У аброва ў зморшчыне. Самотна
Ён стаіць, *задумаўся журботна*,
Непачута плачучы ў пустыні.

*Пераклад Рыгора Барадуліна*